**3 лістапада 2025**
**https://volia-bloc.org/**

# Заява блёку «Воля» з нагоды пачатку набору новых сябраў

Блёк «Воля» пацьвярджае працяг сваёй працы ў межах Каардынацыйнай Рады і распачынае набор новых сябраў і валянтэраў для пашырэньня сваёй дзейнасьці і ўплыву.

Запрашаем усіх зацікаўленых далучыцца да блёку «Воля» і ўзяць удзел у распрацоўцы і рэалізацыі нашых палітык і заплянаваных праектаў: https://docs.google.com/forms/d/e/1FAIpQLScPaJ1eyJ1Te3Hf9sGW1kFXtL6SzIqt8H0f06XN9Aop43Z2MQ/viewform

У цяперашні час мы працуем над рэалістычнымі прапановамі, якія ўлічваюць актуальныя ўмовы, прававыя рамкі і даступныя рэсурсы, пры гэтым набліжаючы нас да дасягненьня праграмных мэтаў.

Мы не адмаўляемся ад мэтаў, акрэсьленых у першапачатковай праграме Блёку, але прызнаем, што шэраг пунктаў дзейнай Праграмы не можа быць выкананы ў цяперашніх умовах праз:

- супярэчнасьці з заканадаўчымі абмежаваньнямі ў краінах, дзе меркавалася яе рэалізацыя;
- адсутнасьць дастатковых фінансавых і арганізацыйных рэсурсаў у бягучы пэрыяд.

Мы гатовыя да адкрытага і канструктыўнага супрацоўніцтва з усімі суб’ектамі дэмакратычнай супольнасьці, якія падзяляюць нашыя прынцыпы дзейнасьці. Мы не ставім сябе ў апазыцыю да партнэраў па Блёку, мы з’яўляемся часткай блёку «Воля» і маем намер дзейнічаць у атмасфэры ўзаемапавагі і салідарнасьці.

Ад імя фракцыі «Блёк “Воля”»,

Віталь Пацехін
Пётр Маркелаў